Мая Берасцейшчына, або Думкі ў дарозе

Цягнік ціхенька крануўся. Будынкі, дрэвы, слупы спачатку адыходзяць, а потым усё хутчэй адбягаюць. І вось за акном вагона паплылі роўныя дагледжаныя палі, лугі. На змену ім прыходзіць лес, часцей – сур’ёзны хваёвы, зрэдку – пяшчотны бярозавы.

За тры гады студэнцтва гэтыя краявіды на шляху Брэст-Гомель сталі для мяне добра знаёмымі. Яны толькі фарбы мяняюць: зялёныя, жоўтыя, карычневыя, шэра-чорныя, белыя (усё залежыць ад пары года). Перад маімі вачыма зноў зялёны. Колер жыцця, росту, спакою…

Сонца схавалася за небакраем… Цягнік імчыць у ноч… А раніцою я зноў убачу зялёнае мора, быццам нікуды і не ад’язджаў. Толькі гэта ўжо будзе Гомельшчына. Калі б у мяне была магчымасць узняцца ў вышыню, то, напэўна, я змог бы ўбачыць той “зялёны лісток на планеце Зямля”, якім уявілася Беларусь Янку Сіпакову. Вось толькі вышыня не дасць магчымасці разгледзець як межы шасці “пазлаў”-абласцей, што складаюць тэрыторыю краіны, так і іх асаблівасці. Каб убачыць адметнасць кожнай вобласці, упэўнены: трэба глядзець знутры, звярнуцца да гісторыі.

Пачаць, на маю думку, варта з назвы. Адкуль яна з’явілася? Чаму Берасцейшчына?

Помню, на гэтае пытанне мы спрабавалі адказаць на ўроку гісторыі. Нехта з нас выказаў меркаванне, што назва паходзіць ад бяросты, якая іграла важную ролю ў матэрыяльнай вытворчасці старажытных славян. І тады настаўніца расказала нам цікавую легенду пра паходжанне Бярэсця, якую я добра памятаю і сёння.

Неяк надта багаты купец недзе з нямецкай зямлі накіраваўся ў Балтыю ехаць, каб там прадаваць свае тавары. Паехаў ён не адзін, а разам з сябрамі. Ехалі некалькі дзён па ледзь пралазных пушчах. І толькі здалося, што выбіліся на добры шлях, як трапілі ў дзікае балота. Некалькі чалавек, коней разам з вазамі згінулі бясследна ў багне. Людзі ў адчаі. Спыніліся пасярод гэтага гіблага месца, крануцца не могуць. Звярнуўся тады купец з малітвай да абраза Маці Боскай Трохручніцы, які заўсёды браў з сабой у дарогу. І здалося ў той момант людзям на балоце, што жаночая постаць з’явілася над імі, завісла на некаторы час у небе, а потым знікла. Купец прыкмеціў, у якім накірунку яна адыходзіла, і зразумеў, куды трэба прабівацца. З надыходам новага дня, па загадзе купца, адны людзі дрэвы секлі і гаць гацілі, а другія яе ў шмат слаёў садранай берастай высцілалі, каб коні не так у твань правальваліся. Праз тры дні ім удалося выбіцца з балота. Загадаў купец бяросту сабраць і пад дубам на ўзвышшы скласці, каб потым на зваротным шляху тут капліцу пабудаваць, прысвечаную Маці Боскай Трохручніцы, якая іх уратавала. Так і зрабілі. З’явілася на гэтым месцы капліца, а з цягам часу вакол яе і людзі пачалі сяліцца. І назва замацавалася – Бярэсце. Потым ужо горад перайменавалі ў Брэст. Вось вам і першая асаблівасць: наш край называюць як Брэстчына, так і Берасцейшчына. Хто яшчэ можа пахваліцца такім багаццем?

Адметныя рысы любой тэрыторыі можна прачытаць у сімвалах, што змешчаны на яе гербе. Герб Брэсцкай вобласці лёгка пазнаць па выяве залатога зубра. Зубр – галоўная жывёла Белавежскай пушчы, аднаго са старэйшых запаведнікаў у свеце. Унікальная прыродная тэрыторыя, якая аб'ядноўвае Беларусь і Польшчу, уключана ў Спіс аб'ектаў сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА. Па колькасці відаў раслін і жывёл Белавежская пушча не мае сабе роўных у Еўропе. Многія прадстаўнікі флоры і фаўны занесены ў Чырвоную кнігу.

Постаць зубра на гербе з'яўляецца сімвалам своеасаблівасці і непаўторнасці прыроды і стабільнасці Берасцейшчыны. Залаты колер жывёлы азначае багацце, сілу, чысціню і ўстойлівасць.

Герб Брэстчыны ўяўляе сабой барочны шчыт, які складаецца з дзвюх частак. Ніжняя выканана ў чырвоным колеры і завяршаецца зубчастым дзяленнем, у якім кожны берасцеец пазнае контуры Камянецкай вежы. Вежа (больш вядома як Белая) з'яўляецца ўнікальным помнікам ваеннага дойлідства XIII стагоддзя і сімвалізуе гераічнае мінулае народа.

Тэрыторыя Берасцейшчыны не раз станавілася арэнай жорсткіх баёў.

У сярэдзіне XVII стагоддзя, падчас баёў паміж войскамі Польшчы, Маскоўскай дзяржавы, Швецыі, казацкімі атрадамі Багдана Хмяльніцкага, у Брэсце ні аднаго двара цэлага не засталося, у Пінску загінула больш за тры тысячы чалавек, Кобрын быў спалены амаль увесь…

У пачатку XVIII стагоддзя значныя разбурэнні і шматлікія чалавечыя ахвяры прынесла Паўночная вайна паміж Расійскай дзяржавай і Швецыяй…

1812 год. Першыя перамогі над Напалеонам былі атрыманы ў бітвах пад Брэстам і Гарадзечна (Пружанскі раён)…

1921 год. Падпісана пагадненне пра спыненне савецка-польскай вайны – Рыжскі мірны дагавор, па ўмовах якога тэрыторыя вобласці адышла да Польшчы ў складзе Палескага (з цэнтрам у Брэсце) і часткова Навагрудскага ваяводства. Узмацняецца падпольная барацьба за нацыянальнае і эканамічнае вызваленне…

22 чэрвеня 1941 года. Брэсцкая крэпасць першай прыняла на сябе ўдар гітлераўскай Германіі. Нягледзячы на тое, што атака была нечаканай для жыхароў цытадэлі і сілы ворага значна пераўзыходзілі магчымасці абаронцаў, нямецкія салдаты сутыкнуліся з моцным супраціўленнем. Без вады, без ежы, без медыкаментаў абаронцы змагаліся некалькі тыдняў. Што давала ім сілы трымацца? Вернасць Радзіме і воінскай прысязе? Так, салдаты прысягалі. Жонкі і дзеці прысягі не давалі, але сталі побач з мужчынамі. Напэўна, сілы ім давала разуменне, што вораг напаў на Радзіму і ўсе разам яны павінны адстаяць яе. Гісторыкі называюць абарону Брэсцкай крэпасці кропкай адліку Перамогі, да якой савецкі народ ішоў амаль чатыры гады, у тым ліку і берасцейцы.

На трэці дзень вайны ў Пінску быў створаны першы ў Беларусі партызанскі атрад. Паступова ён перарос у Пінскае партызанскае злучэнне, якое ўзначальваў Васілій Захаравіч Корж. У 1943-1944 гадах на тэрыторыі Брэсцкай вобласці дзейнічалі ўжо тры партызанскія злучэнні, у якіх налічвалася больш за 50 тысяч чалавек.

Доўгачаканае вызваленне на Берасцейшчыну прыйшло летам 1944 года, але да Перамогі яшчэ быў доўгі шлях. За актыўны ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне больш за 55 тысяч ураджэнцаў Брэсцкай вобласці ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, а чатырнаццаці прысуджана званне Героя Савецкага Саюза.

Мемарыяльныя комплексы "Брэсцкая крэпасць-герой" і "Урочышча Гай" каля Баранавічаў, "Дрэмлева" ў Жабінкаўскім раёне і "Партызанам Палесся" ў Пінску, брацкія магілы, помнікі і абеліскі ў кожным мястэчку – гэта наша памяць пра 1418 дзён суровай вайны, пра гераічныя подзвігі тых, хто набліжаў Перамогу… Памяць, якую беражліва захоўваюць берасцейцы.

Даніну памяці гераічнаму мінуламу вобласці падкрэслівае і чырвоны колер на гербе Брэстчыны. Ён сімвалізуе храбрасць і мужнасць, бясстрашнасць і барацьбу. Побач з чырвоным – блакітны колер. Гэта колер велічы, прыгажосці і яснасці, колер мірнага неба.

Вось ужо 80 гадоў берасцейцы разам з усёй краінай заняты стваральнай працай. Сёння Брэсцкая вобласць – рэгіён высокага патэнцыялу, які мае развіты прамысловы комплекс. Ён уключае каля 250 асноўных прадпрыемстваў розных галін. Брэстчына – адзіны рэгіён краіны, які выпускае электраасвятляльныя лямпы. У нас вырабляюць газавыя пліты, керамічную плітку, фанеру, жалезабетонныя шпалы, прамысловыя вентылятары, мэблю, баваўняныя тканіны, сыры, цукар… Далёка за межамі не толькі вобласці, але і рэспублікі ў цэлым вядомы такія прамысловыя брэнды Брэстчыны, як "Савушкін прадукт", "Санта Брэмар", "Гефест", "Пінскдрэў", цацкі "Палессе"… Берасцейцам ёсць чым ганарыцца!

А вы чулі пра Арбат? Не Маскоўскі, а наш, Брэсцкі? Арбатам называюць вуліцу Савецкую ў Брэсце. На той яе частцы, што з'яўляецца пешаходнай, размясціліся гандлёвыя цэнтры, кафэ, цікавыя помнікі (помнік Тысячагоддзя Брэста, помнік кашальку, бот багацця, скульптурная кампазіцыя "Стары год", якую ў народзе называюць помнікам закаханым кошкам). Жыхароў горада і турыстаў прыцягвае не толькі прыгажосць і ўтульнасць вуліцы, але і магчымасць паслухаць песні, мелодыі падчас музычных вечароў.

Знойдзецца абавязкова які-небудзь скептык і запярэчыць: "Убачыць помнікі і пачуць музыку на вуліцах можна і ў іншых гарадах". Згаджуся, не буду аспрэчваць. Але ёсць на вуліцы Савецкай 17 ліхтароў, якія запальваюцца ўручную. Кожны вечар тут з'яўляецца ліхтаршчык, апрануты ў цёмна-сіні мундзір пятроўскіх часоў, з лесвіцай на плячы, да пояса яго прымацаваны гадзіннік і крэсіва. Здаецца, што ён сышоў са старонак казак Андэрсана. Каб здзейсніць свой рытуал, ліхтаршчык паднімаецца па лесвіцы і ўручную запальвае ў кожным ліхтары газавую лямпу. Традыцыя запальвання ліхтароў – візітная картка Брэста, якой няма больш ні ў адным горадзе свету.

Гуляючы па "Брэсцкім Арбаце", на будынку ювелірнай крамы "Жамчужына" вы ўбачыце памятную дошку, прысвечаную Магдэбургскаму праву. Брэст першы на тэрыторыі сучаснай Беларусі атрымаў яго (15 жніўня 1390 года). І сёння мы з'яўляемся першым рэгіёнам у краіне. Што гэта: простае супадзенне ці наканаванасць?

Што яшчэ выдзяляе Берасцейшчыну сярод іншых пяці “пазлаў”-абласцей беларускай зямлі?

Клімат, безумоўна. Цёплае лета і мяккая зіма абумоўлены размяшчэннем вобласці на паўднёвым захадзе краіны. Толькі, знаходзячыся на адным месцы, я на гэта не звяртаў увагі. Здавалася, што так усюды. Колькі той Беларусі? Сёння, пабываўшы ў розных кутках нашай краіны, хачу вам сказаць, што розніца ёсць. На Міншчыне яшчэ не ўсюды снег сышоў, а ў нас абрыкосы аблітыя белым цветам стаяць, дзьмухаўцы жаўцеюць. На Віцебшчыне пара лістападу, а тут восень толькі кранула пазалотай лісце дрэў. Некалькі гадзін у дарозе, а такая розніца. Цуд!

Беларускі Дзед Мароз. Нягледзячы на цёплы клімат, ён жыве ў нас, у Белавежскай пушчы. Яго казачная рэзідэнцыя так некалі заваражыла мяне, што я зноў паверыў у добрага Дзеда-чараўніка.

Храмы. Сёння яны ёсць амаль у кожным мястэчку, праваслаўныя і каталіцкія. Але ёсць сярод іх некалькі ўнікальных помнікаў беларускага драўлянага дойлідства XVII – XVIII стагоддзяў. Яны перажылі часы ваяўнічага атэізму і захаваліся да нашых дзён практычна ў першародным выглядзе. Свята-Мікіцкая царква ў вёсцы Здзітава, Свята-Міхайлаўская царква ў Чэрску, царква Параскевы Пятніцы ў Дзівіне… Мікалаеўская царква ў Кажан-Гарадку пабудавана з дрэва і лічыцца адным з шэдэўраў палескага народнага дойлідства. У адрозненне ад іншых драўляных храмаў усярэдзіне яго захавалася багатае ўбранне, шматлікія дэталі якога таксама выразаныя з дрэва.

Палессе. Асаблівы раён з самабытнай культурай. Самі палешукі лічаць яго такім. Што ж робіць яго непадобным да іншых месцаў Беларусі? Бязмежныя балоты і іншая мова. На працягу стагоддзяў палеская гаворка фарміравалася пад уплывам беларускай, украінскай і польскай моў. Пазнаёміцца з традыцыямі і фальклорам палешукоў можна, напрыклад, у Моталі. Мястэчка ў свой час славілася кажухамі, а сёння вызначаецца вэнджанымі прысмакамі. Штогод сюды збіраюцца госці на фестываль “Мотальскія прысмакі”. Тут знаходзіцца краязнаўчы музей, прысвечаны побыту жыхароў Палесся. У час экскурсіі дэманструюцца розныя абрады і выконваюцца песні.

Спорава. Аграгарадок у Бярозаўскім раёне, вядомы не толькі за межамі вобласці, але і Беларусі. Раз у тры гады, пачынаючы з 1996, тут праводзіцца фестываль народнага гумару “Спораўскія жарты”. Штогод аматараў дзедавай касы збірае экалагічны фестываль “Спораўскія сенакосы”, удзельнікі якога спаборнічаюць у майстэрстве касьбы на балоце. А спораўскай традыцыі прыгатавання рыбы, сушанай у печы на саломе, і страў з яе надалі статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Людзі. Берасцейшчына падарыла свету нямала вядомых асоб. Тут нарадзіўся апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, а таксама будучы класік беларускай і польскай літаратуры Адам Міцкевіч. Адсюль родам першы прэзідэнт Ізраіля Хаім Вейцман, як і іншы вядомы палітык – Менахем Бегін (ён быў прэм’ер-міністрам гэтай краіны, а пасля атрымаў Нобелеўскую прэмію).

Напалеон Орда – вядомы літаратар, музыкант, кампазітар, педагог, мастак. На яго малюнках і літаграфіях захаваліся знакавыя месцы Беларусі, якія аўтар наведаў у другой палове XIX стагоддзя. Дзякуючы яго працам стала магчымым правесці рэканструкцыю дзясяткаў помнікаў. У Беларусі ёсць некалькі гарадоў, дзе сустракаюцца вуліцы ў гонар Напалеона Орды (Мінск, Гродна і, безумоўна, Брэст). У Варацэвічах, дзе нарадзіўся мастак, дзейнічае музей, прысвечаны жыццю, падарожжам і творчасці, а ў Іванаве (не расійскім, а брэсцкім!) устаноўлены адзіны ў Еўропе помнік у гонар Орды.

Ураджэнец Бярозы Павел Горын-Каляда ў 1930-я гады ўзначальваў Нацыянальную акадэмію навук БССР.

Савецкі касманаўт, двойчы Герой Савецкага Саюза Пятро Клімук, які тройчы пабываў у космасе, таксама берасцеец.

Брэст праславіла Юлія Несцярэнка, якая ў 2004 годзе здолела сенсацыйна выйграць на алімпіядзе ў Афінах “каралеўскую” дыстанцыю – бег на 100 метраў.

Шчодрая Брэстчына на літаратурныя таленты. Колькі пісьменнікаў нарадзілася тут! Піліп Пестрак, Валянцін Таўлай, Анатоль Клышка, Віктар Гардзей, Георгій Марчук, Уладзімір Гніламёдаў, Алесь Разанаў, Раіса Баравікова, Ніна Мацяш…

Кожны кулік сваё балота хваліць. Так, хвалю сваю Берасцейшчыну. І не толькі хвалю, але і ганаруся тым, што я яе дзіця. Куды б ні ехаў, адчуваю да яе асаблівую любоў і замілаванне: у яе склад уваходзіць Бярозаўшчына, з Белым і Чорным азёрамі, з ракой Ясельдай, вёскамі Пескі і Вайцяшын, дзе прайшло маё дзяцінства, дзе жывуць мае бацькі… Толькі гэта ўжо другая гісторыя…